# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## 9 клас
## Варыянт 2

**Заданне 1.** Супрацоўнікі музеяў займаюцца надзвычай складанай, але вельмі карыснай і цікавай справай і ўжываюць пры гэтым адпаведныя спецыяльныя словы.

Запішыце лексіку музейнай справы згодна з нормамі беларускага правапісу.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

| Слова | Правільны варыянт напісання |
|---|---|
| р(а,о)знатыповыя экспанаты | |
| ік(а,о)награфічны | |
| тур(і,ы)нвентар | |
| экскурсан(тс,ц)кі | |
| рэгі(а,я)нальны музей | |
| гіст(а,о)рыяграфія | |

**Заданне 2.** У музейнай справе важна правільна выбраць экспанаты для калекцыі і размясціць іх у такім парадку, каб яны дакладна адпавядалі гістарычнаму перыяду.

Лексічныя значэнні таксама павінны дакладна адпавядаць “свайму” слову. Вызначыце значэнні слоў і ўпішыце нумар правільнага значэння ў апошні слупок.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

| Слова | Значэнні | № значэння |
|---|---|---|
| **дыван** | 1) прадмет мяккай мэблі для сядзення і ляжання, са спінкай і падлакотнікамі;<br>2) тканы, звычайна варсісты ўзорчаты выраб для ўпрыгожвання сцен, высцілання падлогі | |
| **склон** | 1) нахіленая паверхня чаго-н.; пакаты спуск;<br>2) форма іменнай часціны мовы | |
| **плётка** | 1) кароткі раменны плецены бізун, пуга;<br>2) неправераная або лжывая чутка | |
| **плот** | 1) агароджа вакол чаго-н.;<br>2) бярвенне, звязанае ў адзін або некалькі радоў для сплаву па вадзе | |
| **пранік** | 1) салодкае печыва з духмянымі прыправамі;<br>2) плоскі драўляны брусок з ручкай для выбівання бялізны ці абмалоту лёну | |
| **нядзеля** | 1) адзінка вылічэння часу ад панядзелка да наступнай нядзелі ўключна;<br>2) сёмы дзень тыдня | |

**Заданне 3.** Музеі захоўваюць матэрыяльную спадчыну беларусаў, пераносячы нас у свет дзівосных рэчаў, на якіх калісьці трымалася жыццё нашага народа. Фразеалогія ж прыадчыняе перад намі дзверы ў духоўнае мінулае нашых продкаў, паказваючы, як яны ўспрымалі свет, якімі каштоўнасцямі жылі. Таму веданне фразеалагізмаў – яскравае сведчанне прылучанасці чалавека да сваёй культуры.

Прадэманструйце, як вы валодаеце беларускай фразеалогіяй: у пададзеных фразеалагізмах вызначце прапушчаны кампанент, выбраўшы яго з прапанаваных у трэцім слупку. Насупраць абранага кампанента пастаўце ў апошнім слупку знак “+”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Фразеалагізм | Значэнне | Кампанент | + |
|---|---|---|---|
| *не паказваць ...* | ‘не прыходзіць куды-н., не паяўляцца дзе-н.’ | *твару* | |
| | | *фізіяноміі* | |
| | | *носа* | |
| | | *зубоў* | |
| | | *аблічча* | |
| *забыць ...* | ‘перастаць бываць дзе-н., наведваць каго-н.’ | *дарогу* | |
| | | *шлях* | |
| | | *сцежку* | |
| | | *адрас* | |
| | | *дзверы* | |
| *залазіць у ...* | ‘незаконна карыстацца чужым дабром, абкрадваць каго-н.’ | *кішэнь* | |
| | | *кашалёк* | |
| | | *партманет* | |
| | | *куфар* | |
| | | *сейф* | |
| *... з’еў* | ‘набыў вялікі вопыт, навык у якой-н. справе’ | *карову* | |
| | | *сабаку* | |
| | | *ката* | |
| | | *кіта* | |
| | | *слана* | |
| *адным (адной) ... звязаны* | ‘аб’яднаны чым-н. агульным, непарыўным’ | *ланцугом* | |
| | | *шнурком* | |
| | | *шворкай* | |
| | | *нітачкай* | |
| | | *вяроўкай* | |
| *казка пра белага ...* | ‘бясконцае паўтарэнне аднаго і таго з самага пачатку; вяртанне да таго самага’ | *ваўчка* | |
| | | *шашка* | |
| | | *катка* | |
| | | *бычка* | |
| | | *галубка* | |

**Заданне 4.** Экспанаты ў музейных залах і на паліцах заўсёды размяшчаюцца на падставе дэталёвага ўліку суадносін паміж імі. Гэтаксама скрупулёзна мовазнаўцы вызначаюць адносіны вытворнасці паміж словамі.

Паспрабуйце і вы да кожнага прапанаванага дзеяслова дакладна падабраць адзін адпаведнік у якасці вытворнага ад яго слова. Гэта павінен быць просты прыметнік, які трэба запісаць у адпаведным радку табліцы.

***Заўвага.*** Прыметнік можна падбіраць зыходзячы з любога значэння дзеяслова.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | |
|---|---|
| *трашчаць* | |
| *адкідаць* | |
| *абагачаць* | |
| *зыходзіць* | |
| *спаць* | |
| *муляць* | |

**Заданне 5.** Давайце пазнаёмімся з адным з найбольш цікавых беларускіх музеяў. Прачытайце тэкст пра мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой” і запоўніце ячэйкі табліцы зыходзячы з пастаўленай у кожнай ячэйцы задачы.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

Адным з самых папулярных турыстычных аб’ектаў Брэста, ды і ўсёй Беларусі, з’яўляецца сапраўдны музей пад адкрытым небам – мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой”.

Комплекс стаў помнікам подзвігу воінаў, якія першымі прынялі на сябе ўдар войск нацысцкай Германіі летам 1941 года. Крэпасць была ўзведзена ў 1830-х гадах і заняла ***чатыры астравы***[1]. Галоўны і самы вялікі – Цытадэль – быў акружаны суцэльнай двухпавярховай абарончай казармай даўжынёй амаль у два кіламетры і меў ***сотні казематаў***[2]. Усяго ў крэпасці было ***чацвёра варот***[3], 21 мост, звыш 6 кіламетраў абарончых валоў 10-метровай вышыні. Работы па яе ўдасканаленні ***вяліся з перапынкамі***[4], але так і не былі скончаны да Першай сусветнай вайны.

Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці стала значнай падзеяй у гісторыі ***ўсяго беларускага народа***[5]. Каля Вечнага агню, ***што гарыць***[6] на плошчы Цырыманіялаў, пад гранітнымі плітамі пахаваны астанкі 962 абаронцаў крэпасці-героя. Мемарыяльны комплекс, які ўвекавечыў памяць аб іх подзвігу, быў адкрыты да 30-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны, у 1971 годзе. *(Паводле інтэрнэт-рэсурсаў.)*

| | | |
|---|---|---|
| I. Выпішыце слова, якое мае наступную будову: прыстаўка, корань, суфікс, канчатак, постфікс<br>____________________ | II. Зборны лічэбнік запішыце словам у творным склоне<br>____________________ | III. Выпішыце пераходны дзеяслоў II спражэння закончанага трывання<br>____________________ |
| IV. Выпішыце ў пачатковай форме слова, утворанае складана-нульсуфіксальным (складана-бяссуфіксным) спосабам<br>____________________ | V. Выпішыце займеннік, які не мае формы назоўнага склону, у прапанаванай кантэкстам форме і вызначыце яго склон<br>____________________ | VI. Выпішыце ў прапанаванай кантэкстам форме лічэбнік, які ўжываецца ў значэнні займенніка<br>____________________ |

**Заданне 6.** Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі ў тэксце папярэдняга задання словазлучэннямі (спалучэннямі слоў) і іх характарыстыкамі. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад: А1Б2В3Г4). Улічыце, што не ўсе словазлучэнні (спалучэнні слоў) могуць адпавядаць акрэсленым патрабаванням, а таму могуць быць пазіцыі без правільнага адказу.

***Характарыстыкі:***

А – Дапасаванне, сінтаксічна несвабоднае.
Б – Складанае словазлучэнне.
В – Кіраванне з галоўным словам – лічэбнікам.
Г – Кіраванне з галоўным словам – назоўнікам.
Д – Прымыканне з галоўным словам – дзеясловам.
Е – Не словазлучэнне.

| А | | Б | | В | | Г | | Д | | Е | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Один из музеев Полоцка рассказывает об особенностях ручного ткачества на Поозерье. На Беларуси ткачество известно с глубокой древности, о чем свидетельствуют археологические находки (пряслица, отпечатки ткани на керамических сосудах, архаичные орудия труда). Это самый распространённый и старинный вид народного декоративно-прикладного искусства, непосредственно связанный с изготовлением одежды и предметов быта: покрывал, скатертей, полотенец и др. *(По материалам сайта www.tkach.polotsk.museum.by.)*

_______________________________________________________________________________

**Заданне 8.** Нарэшце мы паспрабуем зрабіць уласны віртуальны музей беларускай літаратуры і мастацтва.

Першая зала будзе прысвечана мастацкім сродкам выразнасці. Наша задача – аформіць вітрыну “Эпітэт”. З прыведзеных ніжэй “экспанатаў” выберыце неабходныя і пастаўце на патрэбнае месца, запісаўшы нумар “экспаната” на адпаведнай палічцы. Кожны з “экспанатаў” можна выкарыстаць толькі адзін раз.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| | |
|---|---|
| **1**<br>Ціхі і сіні блішча над хатай<br>Неба прастор.<br>Ціха гайдае ліпа над хатай<br>Лісцяў узор.<br>*Максім Багдановіч* | **5**<br>Ад куточка вока, там, дзе кладзецца першая маршчынка <…> цягнуўся тоненькі шрам, хаваючыся пад <…> кудзеркай на скроні, – след дотыку смерці, след вайны.<br>*Янка Скрыган* |
| **2**<br>Прыходзь, прыходзь жа поўным днём,<br>Сваё мне шчасце дорачы,<br>Пабачыш ты, мая любоў, –<br>Аж сэрцу ў грудзях горача.<br>*Пятрусь Броўка* | **6**<br>Адзіны<br>Віноўца чорных спраў, распраў<br>Зямное і нябеснай кары.<br>*Рыгор Барадулін* |
| **3**<br>Яго нахабныя і страшныя вочы гарэлі вясёлым шаленствам. <…> Чалавек, які сядзіць насупраць <…>, – страшны, вельмі небяспечны чалавек, драпежнік…<br>*Уладзімір Караткевіч* | **7**<br>Ты б мог прыйсці бярозкаю, што ссек,<br>Мурашкаю, што сок з пянёчка выпіла.<br>Ў істоце той, якою быць не выпала,<br>Сябе адчуй хоць зрэдку, чалавек!<br>*Аляксей Пысін* |
| **4**<br>Няма на імшарах палескіх<br>скалістых аснежаных стром…<br>За вёскай – лугі, пералескі,<br>Бяскрайняе поле кругом.<br>*Мікола Аўрамчык* | **8**<br>І сабрала неба фарбы<br>Колераў дзівосных...<br>І дзе ёсць такія скарбы<br>Гожства, сугалосся?!<br>*Якуб Колас* |



| |
|---|
| Эпітэт у вершы, напісаным 3-стопным амфібрахіем |
| Эпітэт і лексічная эпіфара |
| Эпітэт і рытарычнае пытанне |
| Эпітэт у празаічным творы |
| Эпітэт і зваротак |
| Эпітэты, што ўтвараюць антытэзу |

**Заданне 9.** У нашым віртуальным музеі ёсць раздзел, прысвечаны творчасці Францішка Багушэвіча. Уважліва прачытайце прапанаваны урывак. На месцы пропускаў упішыце неабходную інфармацыю і папраўце памылкі там, дзе палічыце патрэбным (закрэсліце памылковыя сцверджанні і зверху напішыце правільныя).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

У пачатку 1884 года Францішак Багушэвіч вярнуўся ў Вільню, дзе заняўся медыцынскай дзейнасцю і напружанай літаратурнай творчасцю.

Тое, што доўгі час па-беларуску пісалася таемна, склала першую кнігу паэта — ___________________________________, якую ён пад псеўданімам Гаўрыла з Полацка выдаў у Кракаве (Аўстра-Венгрыя) у 1891 годзе. А ў 1894 годзе выйшаў другі зборнік паэта – ___________________________________.

Тэматыка, праблематыка і пафас яго творчасці дастаткова разнастайныя. Так, верш “Хмаркі” ўяўляе сабой узор інтымнай лірыкі. Своеасаблівае творчае крэда Францішка Багушэвіча сфармулявана ў вершы “Мая дудка”, дзе дудка ўвасабляе сабой паэзію, якая павінна служыць тым, хто мае ўладу.

Ранняя смерць паэта ў 1900 годзе не дала здзейсніцца яго планам – выдаць чарговы зборнік твораў. Значэнне творчасці Францішка Багушэвіча заключаецца не ў колькасці ім напісанага, а ў велічнасці яго таленту!

**Заданне 10.** Прыйшоў час прыцягнуць увагу да нашага віртуальнага музея беларускай літаратуры і мастацтва. Распрацуйце для яго рэкламны пост, які прыцягне ўвагу вашых аднагодкаў. Ваша задача – цікава і арыгінальна расказаць пра перавагі віртуальнага музея і/або яго ўнікальныя магчымасці, згадаць хаця б двух беларускіх пісьменнікаў (асветнікаў) даўняй літаратуры (XI–XVIII стст.) і трох беларускіх пісьменнікаў XX стагоддзя, натхніць наведаць віртуальны музей менавіта вашых аднагодкаў (!). Выкарыстанне нестандартных ідэй, яркіх вобразаў, гумару вітаецца. Пост не павінен быць большым за 100 слоў. Поспехаў!

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*